# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА Д. П. ЗЕМЛЯКОВАЙ

**Перыяд дзеяння:**

кастрычнік 1941 г. – сакавік 1944 г.

**Месца дзеяння:**

чыгуначная станцыя Лосвіда і в. Доўжа

**Колькасць:**

12 чалавек

**Кіраўнікі:**

Землякова Д. П.

Дзейнічала на чыгуначнай станцыі Лосвіда і ў в. Доўжа з кастрычніка 1941 г. да сакавіка 1944 г. Налічвала 12 чалавек. Кіраўнік Д. П. Землякова. Спачатку ў групу ўваходзілі Т. А. Шамшура (Найдунова), В. К. Парфёнава (Палонская) і Д. П. Землякова.

Увосень 1941 г. падпольшчыкі арганізавалі ўцёкі ваеннапалонных, якія працавалі на будаўніцтве казармы. Група папоўнілася навічкамі, сярод якіх: К. П. і С. І. Воранавы, сям'я Т. А. Шамшура, А. С. Гурко, Я. Я. і Д. Д. Купоўскія, Г. А. Карэйчанка, сям'я Котавых, І. Аляксандраў.

Дом Воранавых стаў канспіратыўнай кватэрай. Парфёнава ўладкавалася на работу ва ўправу, выратоўвала моладзь ад угону ў Германію, забяспечвала партызан і падпольшчыкаў дакументамі і пропускамі, дапамагла выкрыць і абясшкодзіць некалькі варожых агентаў, якіх заслалі ў партызанскія атрады. У пачатку красавіка 1942 г. Землякова і Шамшура звязаліся з аператыўна-чэкісцкай групай А. П. Максіменкі, пазней – Віцебскім падпольным райкамам КП(б)Б. Падпольшчыкам даручылі ўладкавацца на работу да акупантаў. Дар'я Землякова пайшла працаваць прыбіральшчыцай у салдацкай казарме, Шамшура – у нямецкі шпіталь, Д. Кукоўскі стаў паліцэйскім. Сям'я Котавых назірала за чыгункай. Піянер Коля Зямлякоў быў разведчыкам і сувязным.

У выніку агітацыі сярод ахоўнікаў да партызан перайшлі 16 чалавек. Гурко і Аляксандраў, якія атрымалі ад партызан 1-й Беларускай партызанскай брыгады тол і міны, знішчылі мост на шашы каля в. Казлы, падарвалі 2 машыны з харчаваннем і гітлераўцамі. У лютым 1943 г. Землякова даставіла ў в. Доўжа 48 кг толу. 60 % групы складала моладзь, пераважна камсамольцы. Іх гібель была асабліва балючай. А страты былі. У жніўні 1942 г. пры выкананні баявога задання загінуў камсамолец Кукоўскі. Прапаў без вестак В. Пальчыкаў.

У 1943 г. пры ўстаноўцы міны на складзе зброі ў пасёлку Чэпіна быў схоплены Аляксандраў. Пры расклейванні лістовак арыштаваны і закатаваны настаўнік Кім Цітоў. Але патрыёты не спынялі дзейнасці. Здабывалі разведінфармацыю, перадавалі сілкаванне для партызанскіх радыёстанцый, харчаванне, медыкаменты, зімой 1943 г. знішчылі мясцовага бургамістра. Браты Котавы (Іван, Пётр і Аляксандр) пры адыходзе ў партызанскі атрад захапілі з сабой у якасці «языка» нямецкага афіцэра.

Усе члены сям'і Котавых загінулі. Дзейнасць групы ацэнена высока. Д. П. Землякова, адна з нямногіх падпольшчыкаў, узнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга, С. Воранаў – медалём «За адвагу».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Д. П. Земляковай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 485–486.

2. **Подпольная** группа Земляковой Д. П. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 287–288.